ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік дырэктара па навуковай рабоце установы "Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры"
Н.Л.Кальцова
"27" 01 2021 г.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу дзіцячых малюнкаў "Мастак слова – Змітрок Бядуля",**
**прымеркаванага да**
**135-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры**
**Змітрака Бядулі**

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Конкурс "Мастак слова – Змітрок Бядуля" (далей – Конкурс) праводзіцца з нагоды 135-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулі.

1.2. Арганізатар Конкурсу – філіял "Беларуская хатка" (далей – Музей) установы "Дзяржаўны музей гісторыі беларуская літаратуры".

1.3. Конкурс праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.4. Удзельнікі Конкурсу – вучні, навучэнцы.

1.5. Дасылаючы творчыя работы на Конкурс, удзельнікі пацвярджаюць сваю згоду на ўмовы дадзенага Палажэння.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Выхаванне любові і цікавасці да беларускай літаратуры, далучэнне да лепшых яе здабыткаў.

2.2. Папулярызацыя творчасці Змітрака Бядулі.

2.3. Выяўленне, падтрымка і заахвочванне таленавітай моладзі.

## 3. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ І ПАТРАБАВАННІ ДА ТВОРЧЫХ РАБОТ

3.1. Конкурс праводзіцца з 02 лютага 2021 г. па 19 красавіка 2021 г. З 20 красавіка 2021 г. работы для ўдзелу ў Конкурсе прымацца не будуць. Арганізатары Конкурсу пакідаюць за сабой права працягнуць тэрмін яго правядзення.

3.2. На Конкурс прымаюцца творчыя работы, выкананыя ў любой тэхніцы малюнка на тэму, звязаную з жыццём і творчасцю пісьменніка Змітрака Бядулі. Фармат работы не павінен перавышаць памер А3.

3.3. Удзел у Конкурсе могуць прымаць навучэнцы агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, устаноў дадатковай адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 6 да 18 гадоў.

3.4. Для аб'ектыўнага ацэньвання работ удзельнікі падзяляюцца на наступныя групы:

- узроставая група ад 6 да 10 гадоў;
- узроставая група ад 11 да 14 гадоў;
- узроставая група ад 15 да 18 гадоў.

3.5. Працы ацэньваюцца па 10-бальнай сістэме кожным з членаў журы. Журы Конкурсу фарміруецца Арганізатарам Конкурсу ш складзе 3-*х* чалавек, сярод якіх прызначаецца старшыня з правам вырашальнага голасу ў вызначэнні намінантаў на 1-*е*, 2-*е* і 3-*е* месца пры аднолькавай колькасці набраных балаў удзельнікамі Конкурсу.

3.6. Пры адзнацы работ будуць улічвацца арыгінальнасць ідэі, глыбіня раскрыцця тэмы.

3.7. Работы ўдзельнікаў прымаюцца ў Музеі па адрасе: г. Мінск, 220001, вул. Рабкораўская, 19).

3.8. Работы, дасланыя на Конкурс, не рэцэнзуюцца і могуць вяртацца аўтарам пасля заканчэння 2021 года. У перапіску з аўтарамі журы не ўступае.

3.9. Дасланыя на Конкурс работы могуць быць выкарыстаны Музеем у некамерцыйных мэтах без узгаднення з аўтарам, але са спасылкай на аўтарства.

3.10. Арганізатары пакідаюць за сабой права адхіляць работы, якія не адпавядаюць тэматыцы і мастацкаму ўзроўню Конкурсу.

3.11. Да кожнай працы павінна быць прыкладзена заяўка ў адвольнай форме, у якой будуць пазначаны:

- імя, прозвішча аўтара;
- узрост аўтара;
- месца навучання, клас (група);
- кантактны нумар тэлефона, паштовы адрас, пры наяўнасці - адрас электроннай пошты.

3.12. Каардынацыя па правядзенні Конкурсу ўскладаецца на Арганізатараў, якія забяспечваюць яго адкрытасць і сочаць за стварэннем роўных умоў для ўсіх яго удзельнікаў.

3.13. Умовы, тэрміны і вынікі правядзення Конкурсу публікуюцца на сайтах арганізатараў Конкурсу і ў сацыяльных сетках.

## 4. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ І ЎЗНАГАРОДЖВАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

4.1. Па выніках Конкурсу вызначаецца 1-е, 2-е і 3-е месца ў кожнай узроставай катэгорыі.

4.2. Журы Конкурсу мае права заснаваць дадатковыя прызы і намінацыі.

4.3. Журы пакідае за сабою права не прысуджаць 1-е, 2-е і 3-е месцы.

4.4. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца запрашальным білетам на наведванне Музея і ўсіх яго мерапрыемстваў на працягу 2021 г. (на 6 месяцаў), дыпломамі і памятнымі прызамі.

4.5. Вынікі Конкурсу агучваюцца падчас цырымоніі ўзнагароджвання пераможцаў і ўдзельнікаў Конкурсу і размяшчаюцца на сайце **http://bellitmuseum.by** і ў сацыяльных сетках Музея.

4.5. Рашэнні журы з'яўляюцца канчатковымі і перагляду не падлягаюць.

4.6. Час і месца правядзення цырымоніі ўзнагароджвання будуць абвяшчаюцца дадаткова.